# Свабодны Салігорск

Незалежная газета Салігорска

Выдаецца з верасьня 2006 г. пры інфармацыйнай падтрымцы Салігорскага Маладога Фронта ды сайта **saligorsk.org** **№11**




**6 ліпеня 2007 года 16-гадоваму ІВАНУ ШЫЛУ, лідэру Салігорскіх маладафронтаўцаў,**

## ПРАД'ЯЎЛЕНА АБВІНАВАЧВАНЬНЕ

**па артыкуле 193-1 Крымінальнага Кодэксу РБ. Артыкул прадугледжвае пазбаўленьне волі тэрмінам да 2 год за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі (то бок ад Імя Маладога Фронту).**

Іван Шыла, сын высокаадукаваных бацькоў інжынэрна-будаўнічых прафэсіяў, зьяўляецца вучнем Салігорскай школы №4 з паглыбленым вывучэньнем ангельскай мовы, удзельнікам алімпіядаў па гісторыі, добра абазнаным у гуманітарных навуках. Івану насамрэч неабыякава будучыня роднае Беларусі.
І таму ён зьвязаў сваё жыцьцё з нацыянальным адраджэнскім рухам і дзейнасьцю "Маладога Фронту", асноўнымі пастулятамі якога ёсьць нацыянальная ідэя і хрысьціянскія прынцыпы.

**Актыўная Дзейнасьць Івана напалохала ўлады. Супраць хлопца ўзбуджана абсурдная крымінальная справа. Дзеля разуменьня ўсёй абсурднасьці трэба проста азнаёміцца зь некаторымі пунктамі абвінавачваньня.**

Старонка 2

### На Зьмітра Дашкевіча могуць завесьці яшчэ адну крымінальную справу

Пра гэта карэспандэнту «НН» паведаміў салігорскі грамадзкі актывіст Іван Шыла. Іван пабачыў імя Дашкевіча ў матэрыялах сваёй справы.

Старонка 3

### МЫ ПАМЯТАЕМ

7 ліпеня, 7 год таму зьнік журналіст, апэратар тэлеканалу "ОРТ" Зьміцер Завадзкі. 7 ліпеня 2000 г яго апошні раз бачылі ў аэрапорце Менск-2, куды Зьміцер прыехаў для таго, каб сустрэць свайго калегу, журналіста Паўла Шэрамета.

Старонка 4

### Беларускі калій падаражэў

"Беларуская калійная кампанія" (БКК) – эксклюзіўны пастаўшчык калійных угнаенняў РУП "ПА "Беларуськалій" (г. Салігорск, Беларусь) і ААТ "Уралкалій" (г. Бярэзнікі, Расея) на замежныя рынкі дамовіліся аб чарговым падвышэнні цаны на сваю прадукцыю.

Старонка 3

### П.Севярынец: "База для пераменаў – дзесяткі тысяч вернікаў"

Выйшаўшы на волю, Павал Севярынец заняўся кнігавыданьнем. Неўзабаве ў "Бібліятэцы "Нашай ніве" пабачаць сьвет ягоныя "Лісты зь лесу", напісаныя ў Сітне, дзе Павал адбываў двухгадовае пакараньне.А днямі на сядзібе БНФ адбылася прэзэнтацыя кнігі пад назвай "Брату" , куды ўвайшлі палемічныя артыкулы ды эсэ нядаўняга асуджанага.

Старонка 6

### Салігорскі "Шахтар" ня змог трапіць у трэці раўнд Кубка Інтэртота

Салігорскі "Шахтар" ня змог патрапіць у трэці раўнд Кубка Інтэртота. 15 ліпеня на хатнім стадыёне "Будаўнік" у зваротным матчы другога раўнда "Шахтар" прайграў адэскаму "Чарнаморцу" з рахункам 0:2 (галы забілі Паўтавец, 27 хв. з пэнальці, Грышко, 64 хв.).

Старонка 7

### Акцыя Салідарнасьці са Зьмітром Дашкевічам(фота)

20 ліпеня лідару "Маладога Фронта" Зьмітру Дашкевічу спаўняецца 26 год. Сёньня ў Салігорску сябры "Маладога Фронту" правялі акцыю Салідарнасьці з зьняволеным палітыкам. Каля 30 чалавек утварылі на цэнтральнай плошчы ланцуг і трымалі ў руках партрэты Зьмітра Дашкевіча.Гэтым разам быў узьнят і нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг...

Старонка 5



# ДВА ГАДЫ ЗЬНЯВОЛЕНЬНЯ ЗА ІНТЭРВІЮ ЭЎРАПЕЙСКАМУ РАДЫЁ

6 ліпеня 2007 года ІВАНУ ШЫЛА, 16-гадоваму падлетку і лідэру Салігорскіх маладафронтаўцаў, прад'яўлена абвінавачваньне па артыкуле 193-1 КК РБ, які прадугледжвае пазбаўленьне волі тэрмінам да 2 год за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі (то бок ад імя Маладога Фронту).

Іван Шыла, сын высокаадукаваных бацькоў інжынэрна-будаўнічых прафэсій, зьяўляецца вучнем Салігорскай школы №4 з паглыбленным вывучэньнем ангельскай мовы, удзельнікам алімпіяд па гісторыі, добра абазнаным у гуманітарных навуках. Менавіта таму ён больш за астатніх у свае шаснаццаць год хвалюецца за будучыню роднае Беларусі. Менавіта таму ён вырашыў зьвязаць свой лёс зь дзейнасьцю руху "Малады Фронт", асноўнымі пстулатамі для якога зьяўляюцца нацыянальная ідэя і хрысьціянскія прынцыпы.

З-за сваёй неверагоднай актыўнасьці (мала хто з салігорцаў ня чуў пра Малады Фронт) у палітычным жыцьці краіны супраць Івана і была ўзбуджана гэтая абсурдная крымінальная справа. Дзеля разуменьня ўсёй абсурднасьці трэба проста азнаёміцца зь некаторымі пунктамі абвінавачваньня.

**1.** У лютым 2007 году Іван з паплечнікамі сабраў амаль дзве тысячы подпісаў салігорцаў за тое, каб прыпынкі ў грамадзкім транспарце агучваліся па беларуску, а ў навучальных установах салігоршчыны правялі мерапрыемствы прымеркаваныя да 125-годзьдзя з дня нараджэньня Янкі Купалы і Якуба Коласа. За тое, што гэта было зроблена ад імя Маладога Фронту 16-гадоваму падлетку пагражае два гады зьняволеньня.

**2.** Пад час зімовай выбарчай кампаніі ў мясцовыя Саветы Дэпутатаў ён распаўсюджваў (о жах!) ПЕРАДВЫБАРЧЫЯ ўлёткі. За тое, што гэта было зроблена ад імя Маладога Фронту 16-гадоваму падлетку пагражае два гады зьняволеньня.

**3.** У Івана ў хаце былі выяўлены значкі з надпісам "Малады Фронт". За гэта 16-гадоваму падлетку пагражае два гады зьняволеньня.

**4.** Яшчэ адным з найжахлівейшых абвінавачваньняў зьяўляецца тое, што ён, нібыта, з дапамогай кампутарнай тэхнікі зрабіў візытоўкі і пазначыў у іх нумар свайго тэлефона. За тое, што гэта было зроблена ад імя Маладога Фронту 16-гадоваму падлетку пагражае два гады зьняволеньня.



Іван Шыла

**5.** І безумоўна за тое, што, нібыта, Іван у студзені 2007 году па тэлефоне даў інтэрвію журналісту Эрапейскага радыё для Беларусі і зрабіў гэта ад імя Маладога Фронту, за гэта 16-гадовага падлетка трэба асудзіць на два гады зьняволеньня.

А як жа заклікі да гвалтоўнага зьвяржэньня ўлады, дзе эктрымісцкія акцыі і тэрарыстычныя базы аб якіх так гучна распавядаюць беларускія дзяржаўныя тэлеканалы, запытаецеся вы? Ён жа нічога дрэннага не зрабіў! Нават змагаўся за папулярызацыю беларускае мовы. Рабіў ДОБРА!

Але ж справа ў тым, што ён рабіў ДОБРА ад імя Маладога Фронту. За гэта 16-гадоваму падлетку пагражае два гады зьняволеньня.

У жніўні адбудзецца суд над моладзевым актывістам Іванам Шыла. Аднак сваю падтрымку юнаку вы можаце выказаць ужо цяпер затэлефанаваўшы яму па нумары **8-029-370-02-04**. Так сама вы можаце даслаць ліст на паштовую скрыню **abarona2007@gmail.com** са сваімі прапановамі, ідэямі і словамі падтрымкі.

## Моладзевыя актывісты дэмсіл маюць намер арганізаваць шэраг акцый у падтрымку Івана Шыла

Моладзевыя актывісты дэмакратычных сіл маюць намер арганізаваць шэраг акцый у падтрымку свайго паплечніка Івана Шыла. Аб гэтым 10 ліпеня падчас прэсавай канфэрэнцыі заявіў **Барыс Гарэцкі**.

Нагадаем, 6 ліпеня крымінальная справа ў стаўленьні да моладзевага актывіста **І.Шыла** была перададзена ў суд Салігорска (Менская вобласьць). Маладога чалавека вінавацяць у злачынстве, прадугледжаным артыкулам **193-1** Крымінальнага кодэкса (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі). Ён прызнаны абвінавачваным па гэтай справе, зь яго ўзятая падпіска аб нявыязьдзе.

*"Іван Шыла нам паведаміў, што да яго справы "прышпіленыя" касеты, на якіх запісаныя яго тэлефонныя гутаркі. І гэтыя касеты фігуруюць у якасьці доказаў. Пры тым, што дазволы на правядзеньне "праслушкі" у справе няма. Таму мы лічым справа ў стаўленьні І.Шыла пазапраўнай і будзем праводзіць акцыі салідарнасьці зь ім"*, - заявіў **Б.Гарэцкі**.

*"Мы плянуем, што 27 ліпеня, у дзень падпісаньня Дэклярацыі аб сувэрэнітэце Рэспублікі Беларусь, у Салігорску мінуе агульнагарадзкі конкурс графіці на асфальце. Таксама ў апошніх чыслах ліпеня мы маем намер арганізаваць у Салігорску футбольны турнір сярод дваровых каманд пад лёзунгамі вызваленьня палітвязьняў. І, зразумела, мы плянуем вулічную ўлёткавую кампанію, раздачу незалежнай прэсы, вывешваньне бела-чырвона-белых сьцягоў"*, - паведаміў **Б.Гарэцкі**.

Суд над **І.Шыла** павінен пачацца ў першых ліках жніўня, паведаміў Б.Гарэцкі

**Паводле tut.by**

## На Зьмітра Дашкевіча могуць завесьці яшчэ адну крымінальную справу


Зьміцер Дашкевіч

Пра гэта карэспандэнту «НН» паведаміў салігорскі грамадзкі актывіст Іван Шыла. Іван пабачыў імя Дашкевіча ў матэрыялах сваёй справы.

Нагадаем, што Зьміцер Дашкевіч адбывае паўтарагадовае пакараньне ў шклоўскай калёніі за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі («Маладога фронту»). На волю ён мусіць выйсьці 15 сакавіка 2008 г.

Адвакат І. Шылы Мар'яна Сімашка пацьвердзіла словы свайго падаабароннага : «Сапраўды, з крымінальнай справы І. Шылы ў асобную вытворчасьць выдзелена справа Зьмітра Дашкевіча. Зроблена гэта на падставе арт. 402 КК «Адмова ці ўхіленьне сьведкі ад даваньня паказаньняў».

Паводле гэтага артыкулу Дашкевічу можа пагражаць штраф, альбо паўтоду арышту, альбо два гады папраўчых работ. Усе матэрыялы, што датычаць З. Дашкевіча ўжо накіраваныя для азнаямленьня ў шклоўскую калёнію».

**Зьміцер Панкавец**

## АБАРОНІМ МОЛАДЗЬ - АБАРОНІМ БУДЫЧЫНЮ

Салігорская філія Маладога Фронту распачынае хаўрус "АБАРОНА" у падтрымку свайго лідэра Івана Шыла і іншых паплечнікаў. У пляны салігорцаў уваходзіць інфармацыйныя кампаніі, вулічныя і Інтэрнэт-акцыі, звароты да замежных дыпмісіяў, міжнародных праваабарончых і дэмакратычных арганізацыяў.

Маладафронтаўцы выказваюць спадзеў на падтрымку шэрагу мерапрыемстваў у межах хурусу беларускімі дэмакратычнымі сіламі, моладзевымі рухамі, грамадзкімі арганізацыямі і партыямі.

По ўсем пытаньням звязвайцесь :
**+375 2 3700205 +375 29 1347164**
**abarona2007@gmail.com**

## Уначы ў Салігорску гарэў інтэрнат

Пажар у 9-павярховым будынку інтэрната ліцейна-механічнага завода "Універсал" адбыўся ў Салігорску мінулай ноччу. Узгаранне адбылося на другім паверсе. Супрацоўнікі МНС эвакуявалі з будынка інтэрната 45 чалавек, пацярпелых няма. Пашкоджаная маёмасць у адным з пакояў.

# Беларускі калій падаражэў

"Беларуская калійная кампанія" (БКК) – эксклюзіўны пастаўшчык калійных угнаенняў РУП "ПА "Беларуськалій" (г. Салігорск, Беларусь) і ААТ "Уралкалій" (г. Бярэзнікі, Расея) на замежныя рынкі дамовіліся аб чарговым падвышэнні цаны на сваю прадукцыю. Як паведамілі карэспандэнту ІА REGNUM у БКК, перамога ў тэндэры на пастаўку калійных угнаенняў у Шры-Ланку, дазволіла БКК усталяваць новы цэнавы ўзровень на прадукцыю беларускага і расейскага калійных прадпрыемстваў у Паўднёва-ўсходняй Азіі.

Кошт тоны калійных угнаенняў для імпарцёраў Шры-Ланкі, павялічаны на 95 даляраў у параўнанні з узроўнем, усталяваным у ліпені 2006 года, і склаў 300 даляраў за тону. Пасля падпісання дадзенага кантракту дасягнуты новы "псіхалагічны" цэнавы ўзровень на міжнародным экспартным рынку хлорыстага калію – 300 даляраў за тону.

"Цяперашняе падвышэнне цаны з`яўляецца безумоўным поспехам не толькі нашай кампаніі, але і нашых акцыянераў. Эксперты і аналітыкі чакалі, што першыя кантракты на пастаўку калійных угнаенняў па цане ў 300 даляраў за тону будуць падпісаныя экспарцёрамі толькі ўвосень гэтага года.

Шмат у чым у выніку нашых папярэдніх поспехаў нам атрымалася дасягнуць дадзенага цэнавага ўзроўню ўжо ў чэрвені.

Рынак Паўднёва-ўсходняй Азіі - адзін з самых буйных і хуткарослых у свеце, таму ўсталяванне новых цэнаў для спажыўцоў у гэтым рэгіёне, безумоўна, станоўча адаб`ецца на развіцці не толькі БКК і нашых акцыянераў, але і сусветнай калійнай галіны ў цэлым. Усё гэта гаворыць пра тое, што кампанія цалкам эфектыўна адстойвае



інтарэсы беларускіх і расейскіх вытворцаў калію на міжнародных рынках", – заявіў генеральны дырэктар ЗАТ "БКК" Уладзімір Нікалаенка.

Адзначым, што ў чэрвені БКК склала кантракт з адной з В`етнамскіх кампаній на пастаўку каля 30 тыс. тон калійных угнаенняў па цане 295 даляраў за тону, што з`явілася чарговым падвышэннем цаны на міжнародным рынку і на 100 даляраў перавысіла ўзровень цэнаў снежня 2006 года на калійныя ўгнаенні для В`етнама. Поспех, дасягнуты БКК у чэрвені на рынках В`етнама і Шры-Ланкі, дазволіў кампаніі ўжо на пачатку ліпеня 2007 года скласці кантракты на пастаўку калійных угнаенняў у Інданезію і Малайзію па цане 300 даляраў за тону.

# Высечка тапаляў у Салігорску — забойства птушак

Ня першы год у Салігорску ідзе масавая высечка тапаляў. Відовішча ня вельмі прыемнае: ад дрэў застаюцца двухмятровыя пні. Аказваецца, так змагаюцца з крумкачамі. Пачынаецца высечка раньняй вясной, і кожны год ЖКГ, не ўкладваючыся ў тэрміны, працягвае валіць дрэвы, калі птушкі выводзяць нашчадства. І тады на зямлі, сярод галінак і разбураных гнёздаў, кешкаюцца параненыя птушаняты, шмат птушанят — паверце, відовішча не для слабанэрвовых. Летась, праходзячы міма такой жа рубкі тапаляў у адным з двароў, была сьведкай жудаснай карціны: маленькая дзяўчынка, назьбіраўшы ў падол птушанят, наўзрыд угаворвала маму забраць іх дадому.

Сёлета мае дарэмныя спробы як-небудзь паўплываць на сытуацыю посьпехам не ўвянчаліся. Калі сьпілаваныя па пні тапалі — эфэктыўны мэтад барацьбы з крумкачамі, няўжо нельга пачынаць рубку дрэў раней і скончаць да зьяўленьня птушанят?

І ізноў прамова аб праславутым чалавечым фактары. Так, з засільлем крумкачоў — яно само па сабе сьведчаньне экалягічнага няшчасьця — трэба нешта рабіць. Але ў першую чаргу, мусіць, варта шукаць чыньнікі, карані праблемы. А не зводзіць усё толькі да барацьбы са сьледзтвам. Карыстацца ж варварскімі мэтадамі, вядома, недапушчальна ні пры якіх акалічнасьцях.

**Натальля Церахава, жыхарка Салігорска.**

# У Салігорскім вадасховішчы паранейшаму забаронена купацца



Як паведамілі БЕЛТА ў Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялёгіі і грамадзкага здароўя (РЦГЭІГЗ), нягледзячы на тое, што купацца не рэкамэндуецца паранейшаму ў 46 вадаёмах Беларусі, шматлікія з іх апынуліся ў "чорным сьпісе" упершыню. У некаторых месцах масавага адпачынку, уключаных у папярэдні пералік, пасьля атрыманьня добрых аналізаў спроб вады купацца ізноў дазволена.

Па стане на 13 ліпеня пастановы аб забароне купаньня ў Брэсцкай вобласьці вынесеныя для рэк Ведзьма і Шчара Ляхавіцкага раёна, вадасховішчы Белін Драгічынскага раёна. У Віцебскай вобласьці купацца небясьпечна ў Заходняй Дзьвіне, якая праходзіць у чорце Полацка, Наваполацка, Віцебска і гарадзкога пасёлка Бешанковічы, у наваполацкім возеры Моладзевае, у рэках Лучоса і Віцьба ў рысе Віцебска, у азёрах Гомель і Суя ў Полацку, у рэках Днепр і Оршыца і возеры Шчацінка ў рысе Воршы, а таксама ў гарадзкім вадаёме Докшыц.

У Гомельскай вобласьці адпаведнымі пастановамі купацца забаранілі ў зоне адпачынку Жлобіна, на вадаёмах Моладзевы і Рудніцкі ў рысе Гомеля, Сьветлагорскім вадасховішчы, у зоне адпачынку пансіяната "Залатыя пяскі" Гомельскага раёна, на пляжах "Цэнтральны", "Новабелецкі" і "Савецкі" на рацэ Сож. У Магілёўскай вобласьці пастанова вынесенае для гарадзкога пляжу на рацэ Днепр у Шклоўскім раёне, у Гарадзенскай вобласьці - для зоны адпачынку на рацэ Нёман поруч аздараўленчага лягера "Арляня" у вёсцы Барава Іўеўскага раёна, вадаёмаў вёскі Ваекшыцы Бераставіцкага раёна і санаторыя "Пралеска", вадасховішчы Дамба.

У Менскай вобласьці купацца забароненае на рацэ Цітаўка Пухавіцкага раёна, рацэ Случ Слуцкага раёна, Войкаўскім вадасховішчы гарадзкога пасёлка Плешчаніцы Лагойскага раёна, Валожынскім вадасховішчы, Салігорскім вадасховішчы, рэках Ілія і Уша Маладзечанскага раёна, сажалках вёскі Будзенічы і вёскі Шчыткавічы Старадароскага раёна, на возеры ў рысе і ў сажалцы ў парку горада Любань, вадасховішчах Пятровіцкае і Чарніцкае Смалевіцкага раёна. У Менску небясьпечна купацца ў Заслаўскім вадасховішчы, на Камсамольскім возеры, вадасховішчах Дразды і Цна.

У РЦГЭІГЗ растлумачылі, што ў купальны сэзон кратнасьць бактэрыялягічнага дасьледаваньня вады з вадаёмаў у месцах масавага адпачынку павялічваецца ў сярэднім да 1 разу ў тыдзень. Пры атрыманьні двух пасьлядоўных нездавальняльных па бактэрыялягічных паказчыках вынікаў аналізаў вады з адной кропкі адбору тэрытарыяльнымі органамі дзяржнагляду выносіцца пастанова аб забароне выкарыстаньня вадаёма ў культурна-бытавых мэтах.

**Паводле tut.by , Пераклад saligorsk.org**

# У Івана Шылы ўзялі падпіску пра нявыезд

Моладзеваму актывісту Івану Шылу выставілі абвінавачаньне ва ўдзеле ў незарэгістраванай арганізацыі. 16-гадовы Іван Шыла азнаёміўся з матэрыяламі крымінальнай справы разам з бацькам. Справа складаецца зь пяці тамоў.

Сьледчы салігорскай пракуратуры ўзяў з Івана Шылы падпіску пра нявыезд. Справа неўзабаве будзе перададзена ў суд.

## Падпольны продаж алькаголя дзівіць размахам

Каля траціны выпадкаў парушэньня закона так або інакш зьвязаныя з алькаголем. Так, з 427 злачынстваў, расчыненых у Салігорску і раёне, 170 было зьдзейсьнена ў нецьвярозым стане.

Але калі злачынствы, якія здзяйсьняюцца пасьля прыняцьця на грудзі, становяцца ўжо звыклай справай, то вось выпадкі пазапраўнага продажу алькаголя даволі рэдкія, затое, як правіла, дзівяць сваімі маштабамі.

Нядаўна супрацоўнікі салігорскага АБЭЗ спынілі пазапраўны продаж этылавага сьпірту.

Ажыцьцяўляў яе працуючы ў ААТ "Трэст "Шахтаспэцбуд" грамадзянін А., 1977 года нараджэньня. Сьпірт, агульны аб'ём якога складаў 1460 літраў, ён збываў оптам. За тавар прасіў ні шмат ні мала 8 мільёнаў 118 тысяч 320 беларускіх рублёў.

Супраць "прадпрымальніка" узбуджаная крымінальная справа па ч. 1 атр. 233 КК РБ "Пазапраўная прадпрымальніцкая дзейнасьць". Зараз яму пагражае пазбаўленьне волі тэрмінам да трох гадоў.

Тыднем раней быў затрыманы ўладальнік адной з гандлёвых кропак горада: прадаваў гарэлку без сэртыфікатаў адпаведнасьці. Сьпіртнога ў яго знайшлі на агульную суму 1 млн. 921 тысяча 410 рублёў. Дзялку пагражае альбо адміністрацыйны пратакол, альбо тэрмін.

Падпольны продаж алькаголю займае адно зь лідуючых месцаў у пазапраўным абарачэньні грошаў. Але калі "прадаўцы" плацяцца сваёй воляй, то "пакупнікі" прадукта аддаюць куды больш - здароўе. Бывалі выпадкі, калі пасьля ўжываньня падпольнага алькаголю людзі аказваліся ў рэанімацыі нават ад невялікіх доз такога сьпіртнога.

**Дыяна Жураўская**

## ЭІДЭМІЯ СНІДУ НА САЛІГОРШЧЫНЕ

Па стане на 01.05.2007 кумулятыўная колькасьць ВІЧ-інфікаваных (1989 – 2007 г.г.) у Салігорскім раёне склала 580 чалавек (з улікам асоб, выяўленых на тэрыторыі іншых рэгіёнаў рэспублікі, якія пражываюць у Салігорскім раёне - 608 выпадкаў) , у тым ліку за 2007 год - 40 выпадкаў.

Паказчык інфіцыраванасьці складае 418,1 на 100 тысяч насельніцтва. Па Рэспубліцы Беларусь - 83,9 на 100 тысяч насельніцтва, па Менскай вобласьці - 62,6 на 100 тысяч насельніцтва.

Пераважная колькасьць ВІЧ-інфікаваных - гэта маладыя людзі ад 15 да 29 гадоў. Агульная колькасьць выпадкаў ВІЧ-інфекцыі ў гэтай узроставай групе складае 490 чалавек (удзельная вага ў агульнай структуры ВІЧ-інфікаваных- 80,1 %).

З ліку ВІЧ-інфіцыраваных 69,8% (429 чалавек) прыходзіцца на дзель мужчын, 30,2 % (183 чалавека) - на дзель жанчын, аднак назіраецца сталае павелічэньне колькасьці жанчын, уцягнутых у эпідэмічны працэс. У апошні час суадносіны паміж колькасьцю мужчын і жанчын складае 1:1, у то час як на пачатковым этапе эпідэміі яно ўраўноўвалася 4:1.

Асноўны шлях перадачы інфекцыі - парэнтэральны, які рэалізоўваецца пры ін'екцыйных уводзінах наркатычных сродкаў - (429 чалавек) 70,6%, палавы шлях - (115 выпадкаў) - 18,9 %. У цяперашні час назіраецца тэндэнцыя павелічэньні колькасьці людзей, інфікаваньне якіх адбываецца ў выніку сэксуальных кантактаў. У 2006 г. палавы шлях заражэньня склаў 38,5%.На працягу 1996 - 2006 г.г. ва ўзроставай структуры ВІЧ-інфікаваных паменшылася ўдзельная вага ўзроставай групы 15-19 гадоў з 18,7 % у 2002 г. да 4,2 % у 2006 г.

**Прэс-служба МФ**

## Салігорскі "Шахтар" ня змог трапіць у трэці раўнд Кубка Інтэртота

Салігорскі "Шахтар" ня змог патрапіць у трэці раўнд Кубка Інтэртота. 15 ліпеня на хатнім стадыёне "Будаўнік" у зваротным матчы другога раўнда "Шахтар" прайграў адэскаму "Чарнаморцу" з рахункам 0:2 (галы забілі Паўтавец, 27 хв. з пэнальці, Грышко, 64 хв.).

Нагадаем, што ў першым матчы, мінулым 7 ліпеня ў Адэсе, мацней таксама быў "Чарнаморац" — 4:2. У трэцім крузе клюб з Адэсы сустрэнецца з французскім "Лансам".

17 ліпеня адбудзецца першы матч першага кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў, у якім барысаўскі БАТЭ правядзе госьцевы паядынак супраць кіпрскага клюба "Апаэль" (Нікосія). Зваротны матч мінуе ў Барысаве 24 ліпеня.

19 ліпеня два беларускіх клюба — "Дынама" (Менск) і "Дынама" (Брэст) — прымуць старт у Кубку ЎЕФА. У першым адборачным раўндзе менчукі згуляюць супраць рыскага "Сконта", а берасьцейцы — супраць ліепайскага "Мэталюрга". Свае першыя матчы беларускія каманды правядуць на выездзе. Зваротныя гульні адбудуцца 2 жніўня.

**Паводле esoligorsk.net | Пераклад saligorsk.org**

## Гандляры схільныя падтрымаць уладу

Жарсьці вакол муніцыпальнага рынку ў цэнтры Салігорска ўляглiся. Аднак індывідуальныя прадпрымальнікі, якія нядаўна дружна адстойвалі свае інтэрэсы, зараз падзяліліся.

– *Што Дамашкевіч і старшыня райвыканкама абяцалі – усё выканана,* – гаворыць сябра Рады рынку **Тацьцяна Кучынская.** – *Мы падзячны ліст з гэтай нагоды ў іх адрас напісалі. Раз улада да нас прыслухалася, не абдурыла, не завалакіціла, прадпрымальнікі таксама павінны выканаць свае абяцаньні. Праўда, знайшліся сярод нас несьвядомыя, ваду каламуцяць.*

Аб чым прамова? Прадпрымальнікі ў момант заключэньня негалоснай дамовы зз уладай паабяцалі таксама пералічыць грошы за праект рынку і замяніць свае кантэйнэры на ралеты, мелыя больш элегантны выгляд. А зараз усё больш гавораць, што праславутае абяцаньне давалася далёка не ўсімі. І хадзі давядзі зваротнае – пратакол тады не афармляўся...

– *Грошы за праект па 100 тысяч мы падалі,* – распавядае прадпрымальнік **Вера Максымовіч**. – *А вось наконт ралетаў... Кошт аднаго чатыры з паловай тысячы даляраў. Далёка ня ўсе знойдуць такія грошы. Нават з улікам, што на замену далі тэрмін аж да новага года.*

Па словах чальцоў Рады рынку, некаторыя ўжо і скаргу ў аблвыканкам адправілі: маўляў, пазапраўна прымушаюць да куплі дарагога абсталяваньня гандлёвага месца. Сапраўды, старшыня салігорскай вэртыкалі нагадвае аб ралетах. Хоць адчыненага прымусу пакуль няма, і ці будзе? У мэра галява баліць, вядома, каб да юбілею гараду ўсё тып-топ было. Але карай пакуль не пагражае.

– *Мы павінны стрымаць сваё слова,* – настойвае *Тацьцяна Кучынская.* – *Бо дамова ёсьць дамова – навошта ізноў недавер?*

Яе апанэнты сцвярджаюць: ніякай катастрофы ня будзе, калі нараўне з ралетамі застануцца і кантэйнэры. Навошта лезьці з скуры прэч, даказваючы ўладзе сваю высокую матэрыяльную забясьпечанасьць, калі такой насамрэч шматлікія дробныя бізнэсоўцы ня маюць. Плаціць бы своечасова падаткі... А вось што ў дадзеным выпадку некаторыя прадпрымальнікі жаляцца ў вышэйстаячыя інстанцыі – з гэтым на рынку шматлікія ня згодны. Ня трэба наўмысна падстаўляць і службоўцаў. Бо ніхто нікога гандлёвага месца не пазбаўляе.

## Шахтар (Салігорск) — Дынама (Брэст) — 3:2 (0:1)

Завяршыліся матчы 13-га тура першынства краіны. Салігорскі Шахтар выйграў у Дынама з Брэста з рахункам 3:2. Матч адбыўся ў Салігорску на стадыёне «Будаўнік» у прысутнасьці 1830 гледачоў. Першы тамака скончыўся з перавагай у 1 мяч у нажытак госьцяў. У другім тайме Шахтару атрымалася адыграцца і давесьці матч да перамогі. Судзіў гульню судзьдзя зь Менска Аляксандар Чабыкін.

Статыстыка матчу: 0:1 — Віктар Сокал, 38 хвіліна. 1:1 — Аляксей Рыас, 48 хвіліна. 1:2 — Раман Гогінашвілі, 84 хвіліна. 2:2 — Аляксандар Кліменка — з пэнальці, 89 хвіліна. 3:2 — Андрэй Ляончык, 90+3.

Выдаленьне: Панасюк (Дынама), 42 хвіліна.

## У чым прычына адставак у КДБ?




Чаму звольненыя кіраўнік КДБ Сьцяпан Сухарэнка і ягоны першы намесьнік Васіль Дземянцей? Як паўплываюць гэтыя кадравыя рашэньні на палітычную сытуацыю ў краіне ў цэлым? Фрагмэнт "Экспэртызы Свабоды" з удзелам шэф-рэдактара "Народнай волі" Сьвятланы Калінкінай і рэдактара Інтэрнэт-выданьня "Ежедневник" Сяргея Сацука.

**Дракахруст:** **"**У чым прычына сёньняшніх адставак у КДБ? Незалежныя выданьні – у тым ліку і вашы – пісалі пра вайну кланаў ва ўладнай эліце, пра жорсткія сутыкненьні паміж КДБ і МУС. Але звычайна ў сыстэмах, падобных на беларускую, вышэйшы кіраўнік захоўвае баланс паміж групоўкамі ў сваім атачэньні, а не ахвяруе адной зь іх."

**Калінкіна:** **"**Я думаю, што прычыны ў комплексе: і ў тым, што нарадзіліся пляны па ўзмацненьню КДБ, па падпарадкаваньню менавіта Камітэту дзяржбясьпекі шэрагу сілавых структур – з памежных войскаў, са службы бясьпекі прэзыдэнта; і ў барацьбе паміж кланамі, у якой заўсёды на нейкім этапе перамогу атрымліваюць то адны, то другія. Я б не сказала, што Лукашэнка сёньня, падпісаўшы ўказы аб адстаўцы Сухарэнкі і Дземяньцея, ахвяраваў імі, але на дадзены момант, верагодна, усё ж міністар унутраных спраў Навумаў узяў верх."

**Сацук**: "Я згодны, што адказ трэба шукаць у комплексе прычынаў – нельга казаць, што гэта толькі барацьба кланаў. Але на маю думку, сярод галоўных прычынаў – тое, што КДБ пад кіраўніцтвам Сухарэнкі было пазбаўленае гнуткасьці. Сухарэнка дзейнічаў як салдат: грымела шмат, а толку было мала. Таму ніякіх заслуг Сухарэнкі за апошні час назваць нельга.

Апрэч таго, варта сказаць, што адстаўка Сухарэнкі – шмат у чым працяг адстаўкі Дамашкевіча. Паколькі вядома, што Дамашкевіч з Сухарэнкам былі сябрамі, і Сухарэнка шмат у чым ахвяраваў дзяржаўнымі інтарэсамі, абараняючы інтарэсы свае і Дамашкевіча. І гэта таксама адна з прычынаў: калі чыноўнік такога рангу свае інтарэсы ставіць вышэй за дзяржаўныя. А прэзыдэнт гэтага вельмі ня любіць."

**"Сухарэнка дзейнічаў як салдат: грымела шмат, а толку было мала."**

**Дракахруст**: "А ці не было ў гэтых адстаўках палітычнай подбіўкі, як гэта было ў свой час з адстаўкай Мацкевіча? Адносіны з Расеяй цяпер кепскія, справы ў эканоміцы так сабе, і хто ведае, якія думкі лунаюць пад генэральскімі фуражкамі? Зьвяртае на сябе ўвагу тое, што ў адстаўку адпраўлены ня толькі кіраўнік КДБ, а і ягоны першы намесьнік. І пастаўлены на КДБ чалавек, які да сёньняшняга дня ня быў у структуры Камітэту. Гэта такая форма выражэньня недаверу ўсяму КДБ?"

**Сацук**: "КДБ дае таму ж МЗС, той жа адміністрацыі прэзыдэнта факты, матар'ял для працы ў зьнешняй палітыцы. Той факт, што КДБ абвясьціла пра затрыманьне шпёнаў, што Польшча афіцыйна прызнала, што затрымалі беларускага шпёна, гісторыя з прэфэрэнцыямі – гэта гаворыць, што на зьнешнепалітычным фронце поўны крах, і шмат у чым гэта віна КДБ. Бо яно ня можа прадставіць уладзе аргумэнтаў, схаваных рычагоў для ўзьдзеяньня на зьнешнепалітычным фронце."

**Дракахруст:** Сьвятлана, ці ня лічыце Вы, што гэтыя польскія шпёны былі апошняй кропляй? І больш шырока: ці бачыце Вы ў гэтай адстаўцы палітычную подбіўку?

**"КДБ граў расейскую гульню, і верагодна, што ў сёньняшняй Беларусі гэта ўжо не вітаецца, як раней."**

**Калінкіна:** Я сапраўды была зьдзіўленая гэтым шпёнскім польскім скандалам, таму што апошнія месяцы беларускае кіраўніцтва прысьвяціла шмат часу таму, каб былі наладжаныя адносіны з той жа Польшчай, і нават дасягнула посьпехаў у гэтым кірунку: у Кіеве ўпершыню польская дэлегацыя галасавала супраць рэзалюцыі па Беларусі. І ў гэтым сэнсе скандал, які быў справакаваны з Масквы, сапраўды ня ўпісваўся ў сёньняшні рух беларускай улады – хаця б і зьнешні, і дэкляратыўны.

Шмат і расейскіх, і беларускіх выданьняў пацьвердзілі, што скандал быў справакаваны з Расеі – менавіта пад гэтыя падзеі з разьмяшчэньнем у Польшчы супрацьракетнай абароны і мараторый Расеі на Дамову аб звычайных узбраеньнях у Эўропе. А самі гэтыя шпёны былі затрыманыя яшчэ ўзімку. Мне відавочна, што ў гэтым выпадку КДБ разам са Сьцяпанам Сухарэнкам граў расейскую гульню, і верагодна, што ў сёньняшняй Беларусі гэта ўжо не вітаецца, як раней, і тое, што кіраўнікі ведамства лічылі, што яны дакажуць сваю значнасьць: што яны ловяць шпёнаў, а ня толькі пацукоў – наадварот зрабіла ім дрэнную паслугу, і наадварот – магло паслужыць прычынай адстаўкі ў сёньняшніх умовах.

Прызначэньне Жадобіна на КДБ – гэта, на мой погляд, абраза Камітэту, але Лукашэнка кіраваўся, як мне здаецца, толькі крытэрыем "набліжанасьці да цела". А Жадобін на дадзеным этапе бліжэй, чым хтосьці іншы з намесьнікаў Сухарэнкі.

Генэрал Юры Жадобін працаваў на пасадзе кіраўніка Службы аховы прэзыдэнта ад 9 верасьня 2003 году. Ён нарадзіўся ў 1954 годзе ў Днепрапятроўску. Ва ўзброеных сілах – з 1972 году. У 1976 годзе скончыў Казанскую вышэйшую танкавую камандную вучэльню, у 1985 – камандны факультэт Ваеннай акадэміі бронетанкавых войскаў у Маскве. За час ад 1976 году да 1990-га даслужыўся да камандзіра палка. Ад 1990-га да 1999 году служыў на камандных пасадах у сыстэме Грамадзянскай абароны Беларусі і ўнутраных войсках МУС. Ад 1999 году і да прызначэньня на пасаду кіраўніка Службы аховы прэзыдэнта працаваў намесьнікам міністра ўнутраных справаў – камандуючым унутранымі войскамі Рэспублікі Беларусь.

**Паводле svaboda.org**

## ДЗЕНЬ ЗЬНІКНЕНЬНЯ ЗЬМІТРА ЗАВАДЗКАГА


Зьміцер Завадскі

У гэты дзень, 7 год таму зьнік журналіст, апэратар тэлеканалу "ОРТ" Зьміцер Завадзкі. 7 ліпеня 2000 г яго апошні раз бачылі ў аэрапорце Менск-2, куды Зьміцер прыехаў для таго, каб сустрэць свайго калегу, журналіста Паўла Шэрамета.

Сёньня ў Менску каля дому па вуліцы Данілы Сердзіча, дзе жыў і адкуль выехаў у той дзень Зьміцер Завадзкі, адбылася акцыя памяці аб зьніклым журналісьце. Нагадаем, што ў зьнікненьні Завадзкага прадстаўнікі дэмакратычных сілаў Беларусі й шматлікія міжнародныя арганізацыі абвінавачваюць асабіста Аляксандра Лукашэнку й яго бліжэйшых паплечнікаў. На гэты момант дастаткова доказаў і фактаў, якія сьведчаць аб тым, што Зьміцер Завадзкі гэтак як і ўсе астатнія зьніклыя беларускія палітыкі й грамадзкія дзеячы, быў забіты па загадзе вышэйшага кіраўніцтва краіны.

**Прэс-служба МФ**

## Мілінкевіча затрымалі ў памежнай зоне



Недзе а 18-й гадзіне ў Астраўцы быў затрыманы лідэр руху «За свабоду» Аляксандар Мілінкевіч.

У аўторак ён знаходзіцца зь візытам на Гарадзеншчыне, дзе зьбіраўся, у прыватнасьці, наведаць Смургоні, Астравец і Ашмяны. У Астраўцы Мілінкевіч зьбіраўся правесьці сустрэчы зь мясцовымі актывістамі. Як толькі сустрэча пачыналася, да палітыка падышлі міліцыянты, якія папрасілі прайсьці зь імі дзеля высьвятленьня абставінаў знаходжаньня Мілінкевіча ў памежнай зоне.

Цяпер экс-кандыдат у прэзыдэнты знаходзіцца ў аставецкім райаддзеле міліцыі, ягоны тэлефон адключаны. А 19:00 Мілінкевіч мусіць быць у Ашмянах, дзе зьбіраўся правесьці яшчэ адну сустрэчу зь людзьмі.

**Зьміцер Панкавец**

## Акцыя Салідарнасьці са Зьмітром Дашкевічам(фота)



20 ліпеня лідару "Маладога Фронта" Зьмітру Дашкевічу спаўняецца 26 год. Сёньня ў Салігорску сябры "Маладога Фронту" правялі акцыю Салідарнасьці з зьняволеным палітыкам. Каля 30 чалавек утварылі на цэнтральнай плошчы ланцуг і трымалі ў руках партрэты Зьмітра Дашкевіча.

Гэтым разам быў узьнят і нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг, пасьля чаго адбыўся інцыдэнт: супрацоўнікі міліцыі паспрабавалі затрымаць маладзёнаў, што трымалі ў руках нацыянальнае палотнішча.

Аднак, негледзячы на ўпартасьць міліцыянтаў, усё спробы скончыліся беспасьпяхова: моладзь спраўна бараніла сваіх і нацыяльную сымболіку.



Акцыі Салідарнасьці ў Салігорску ладзяцца на працягу двух гадоў. Моладзь штомесяц патрабуе ад уладаў вызваліць палітычных вязьняў, спыніць перасьлед маладзёвых арганізацыяў і выказвае падтрымку сваяк зьняволеных актывістаў.



Прэс-служба Салігорскага МФ , фота fota.saligorsk.org

## Акцыя да гадавіны зьнікненьня Завадзкага



Сёньня салігорскі "Малады Фронт" правёў трыдцыцьйную акцыю ў гадавіну зьнікненьня журналіста Зьмітра Завадзкага.

-Мы усьведамляем важкасць Салідарнасьці, мы разумеем важкасьць такіх акцыяў для сваякаў Зьмітра.

Мы будзем ладзіць такія акцыі штогод, покуль улады не дадуць адказу на нашыя пытаньні "Дзе Завадзкі?", покуль ня будзе праведзена расьледваньне і высьветлена, хто мае датычанасьць да гэтага злачынства."

Беларусі й шматлікія міжнародныя арганізацыі абвінавачваюць асабіста Аляксандра Лукашэнку й яго бліжэйшых паплечнікаў. На гэты момант дастаткова доказаў і фактаў, якія сьведчаць аб тым, што Зьміцер Завадзкі гэтак як і ўсе астатнія зьніклыя беларускія палітыкі й грамадзкія дзеячы, быў забіты па загадзе вышэйшага кіраўніцтва краіны.

Бліжэйшым часам у Салігорску мае адбыцца яшчэ некалькі мерапрыемтсваў, прымеркаваных да гадавіны зьнікненьня Зьмітра Завадзкага.

## МЫ ПАМЯТАЕМ

Яшчэ адна акцыя прысьвечаная 7-й гадавіне з дня зьнікненьня журналіста Зьмітра Завадзкага абылася ў Салігорску.

Увечары 10 ліпеня на цэнтральнай плошчы гораду маладафронтаўцамі быў зьмешчаны транспарант з надпісам "МЫ ПАМЯТАЕМ" вакол якога салігорская моладзь запаліла памятныя сьвечы салідарнасьці. Агмень свечаў прывабіў шматлікіх мінакоў, якія зь цікавасьцю дапытваліся пра акцыю.

Нагадаем, 7 год таму зьнік журналіст, апэратар тэлеканалу "ОРТ" Зьміцер Завадзкі. 7 ліпеня 2000 г яго апошні раз бачылі ў аэрапорце Менск-2, куды Зьміцер прыехаў для таго, каб сустрэць свайго калегу, журналіста Паўла Шэрамета. У зьнікненьні Завадзкага прадстаўнікі дэмакратычных сілаў Беларусі й шматлікія міжнародныя арганізацыі абвінавачваюць асабіста Аляксандра Лукашэнку й яго бліжэйшых паплечнікаў. На гэты момант дастаткова доказаў і фактаў, якія сьведчаць аб тым, што Зьміцер Завадзкі гэтак як і ўсе астатнія зьніклыя беларускія палітыкі й грамадзкія дзеячы, быў забіты па загадзе вышэйшага кіраўніцтва краіны.




Паводле saligorsk.org

### Рух за Свабоду раздае буклеты

6 ліпеня актывісты руха "За Свабоду" з самае раніцы на ганку райвыканкаму раздавалі інфармацыйныя буклеты "Што Эўразьвяз можа даць Беларусі" чыноўнікам, што сьпяшаліся на працу. Акцыя прайшла без затрыманьняў.

Гэта адна зь першых акцыяў руха ў Салігорску, напачатку чэрвеня актывіст руху Павал Батуеў быў затрыманы па падазрэньні ў вывешваньні расьцяжак "Свабоду маладафротаўцам".

### У Салігорску будзе алея імя Янкі Купалы

Салігорскі гарвыканкам даў дазвол на адкрыццё ў горадзе алеі імя Янкі Купалы. Заяўку на гэта падаваў у траўні грамадзкі актывіст Аляксей Валабуеў.

Праўда, яшчэ ня вызначалася месца, дзе будзе пасаджаная гэтая алея — ініцыятары ніяк ня могуць сустрэцца з галоўным архітэктарам гораду сп-няй Кругловай, каб абмеркаваць канкрэтнае месца.

# Экспэрт за больш жорсткае стаўленьне ЗША да Беларусі



Экспэрт амэрыканскага Цэнтру разьвіцьця Мортан Гальпэрын заклікаў амэрыканскіх кангрэсмэнаў да правядзеньня больш жорсткай палітыкі ў дачыненьні да такіх аўтарытарных краін, як Беларусь, Расея, Азэрбайджан і Узбэкістан.
У часе адмысловых слуханьняў у Капітоліі вядомы амэрыканскі палітоляг, у прыватнасьці, заявіў, што "ёсьць дыктатары, зь якімі трэба неадкладна высьветліць дачыненьні".
Паводле Гальпэрына, палітыка ЗША павінна сыходзіць з таго, што зацікаўленасьць у ЗША дзяржаваў – парушальніц правоў чалавека – куды большая, чым амэрыканская зацікаўленасьць у гэтых рэжымах. Таму, лічыць Гальпэрын, "пазыцыя Вашынгтону павінна быць больш жорсткай у дачыненьні да гэтых краін"

У сьпіс 11 самых сур'ёзных парушальнікаў правоў чалавека, які складзены падкамітэтам Кангрэсу ў міжнародных справах, уваходзяць Расея, Беларусь, Азэрбайджан, Узбэкістан, а таксама Кітай, Куба, Эгіпет, Саудаўская Арабія.

**Паводле svaboda.org**

# Салігорскі Малады Фронт арганізаваў футбольны турнір

17 ліпеня Салігорскі "Малады Фронт" аргінізаваў у Салігорску футбольны турнір сярод дваровых каманд.
6 камандаў прыкладалі ўсё намаганьні, каб перамагчы. Негледзячы на моцную сьпякоту, моладзь дэманстравала футбольнае майстэрства.
Удзел у спартовых спаборніцтвах узяла і каманда "Маладога Фронту", якая,па меркаваньнях удзельнікаў, трымалася годна паказвала добру гульню.
-Цікавейшыя па сваму накалу гульні, імкненьне перамагчы, эмоцыі.. гэтыя словы асьцырыюцца ў мяне зь маладафронтаўскім турнірам.-кажа адзін з удзельнікаў.
-Малады Фронт дэмантструе грамадству, што займаецца ня толькі палітычнай барацьбою. Сёньняшняе мерапрыемства-унёсак моладзі ў выхаваньне здаровага пакаленьня беларускае моладзі. На дадзены момант, нам падаецца вельмі важкім правядзеньне мерапрымстваў такога кшталту, гэта своеасаблівае навязваньне моды на спорт, здаровы лад жыцьця, што зьяўлецца адной з асноўных мэтаў нашае арганізацыі.

**Паводле saligorsk.org**






## Негасьцінны Кіпр

17 ліпеня адбыўся першы матч першага кваліфікацыйнага раўнду Лігі чэмпіёнаў. Чэмпіён Беларусі барысаўскі БАТЭ прайграў на Кіпры клюбу «Апаэль» (Нікасія) зь лікам 0:2. На 42-й хвіліне гол забіў Хрысіс Міхаіл, на 60-й Ніклас Махлас.
Гульня ў адказ пройдзе праз тыдзень, 24 ліпеня ў Барысаве.
У чацьвер старт у першым кваліфікацыйным раўндзе Кубку УЭФА возьмуць менскія і берасьцейскія дынамаўцы. Менчукі згуляюць са шматразовым чэмпіёнам Латвіі «Сконта», берасьцейцы – з «Мэталюргам» (Ліепая). Абедзьве гульні – у Латвіі. Матчы ў адказ 2 жніўня.
А ў нядзелю разьвітаўся з эўракубкамі салігорскі «Шахцёр», які па выніках двух матчаў прайграў у другім раўндзе Кубку Інтэртота адэскаму «Чарнаморцу» – 2:4, 0:2.

# Курапаты – звычайны хвойнік. Такія ў нас паўсюль/Фотарэпартаж

Ва ўзгорыстым бары на ўскраіне Менску больш за 500 правалаў. У кожным правале – косьці дзесяткаў і сотень забітых за часы сталінскага генацыду. Калі людзей расстрэльвалі й закопвалі поўную яму на 2-3 м глыбінёй – трупы тлелі, плоць разлагалася й зямля прасядала. 250 тысячаў забітых.
Блукаеш сярод крыжоў і дрэваў, прыслухоўваесься да шолаху хвояў, удыхаеш на поўныя грудзі і, дрыжучы, з жахам адчуваеш, што гэта – самае страшнае месца ў сэрцы Эўропы.
Людзей забіралі зь перапоўненых падвалаў Менскага КДБ, адкуль зімой праз аддушыны на вуліцу валіла пара. Бліжэй да ночы везьлі за горад, у агароджанае плотам урочышча. Падводзілі шэрагам да ямы і проста гваздалі ў патыліцу.
Курапаты – гэта яшчэ адно месца, у якое імпэрыя зла забівала цьвік, укрыжоўваючы Беларусь.
Бах! – і са стрэлам у патыліцу чалавек валіўся ў яму.
Бах! – і мэталёвае вастрыё зноў працінала беларускую плоць наскрозь.
Бах! – чулі жыхары навакольных вёсак і міжволі жагналіся.
Бах! – і вось, на крыжы, скрываўленая, расьцятая, падымалася па-над зямлёй уся краіна.
Лес у Курапатах таго ж узросту, што й пахаваньні: магілы засаджвалі хвойнікам. Вы бачылі гэтыя страшныя дрэвы, гэтыя сталёвыя ствалы аграмадных цьвікоў, якія прабіваюцца зь зямлі, рвуцца з самых крывавых каранёў, і апчаперваюць тысячы й тысячы іглаў у неба?..
Курапаты адкапаў Зянон Пазьняк.
Ён не пабаяўся той нячыстай сілы, што глядзела з пустых вачніцаў чарапоў, таемна выграбала й вывозіла косьці на сьметнік у чатырох кіляметрах адсюль, якая за 70 гадоў ператварыла беларускую зямлю ў адзіны суцэльны магільнік... "Была на мне рука Госпада, і Гасподзь вывеў мяне духам і паставіў мяне пасярод поля, і яно было поўнае касьцей..." – так кніга прарока Эзэкііля ( 37:1 ) пачынае аповед пра паўстаньне народу зь мёртвых.
Так, менавіта з Курапатаў вымкнуў масавы нацыянальны рух. 30 кастрычніка 1988 г. на Дзяды, калі тут на шматтысячным мітынгу быў упершыню за дзесяцігодзьдзі ўзьняты бела-чырвона-белы сьцяг – улада разагнала людзей дубінкамі й газам.
У адказ Беларусь выбухнула – мітынгі пачаліся па ўсёй краіне. Паўстаў Беларускі Народны Фронт. У Курапатах зьявіўся стыхійны мэмарыял – сотні крыжоў.
Памятны знак паставіў тут падчас свайго візыту ў Беларусь прэзыдэнт ЗША Біл Клінтан.І калі ўвосень 2001 г., пасьля чарговых перавыбараў Лукашэнкі, праз Курапаты пачалі будаваць Менскую кальцавую, разьбіраючы крыжы й памятныя знакі – на кругласуткавую бестэрміновую абарону Курапатаў стала ўжо беларуская моладзь.
Курапаты – гіганцкі ахвярнік. Таму сюды, быццам да алтару, прыходзяць маліцца тыя, хто любіць Беларусь. Тыя, хто ня верыць у Бога, баяцца гэтага месца. Бо сіла беларускай свядомасьці крынічыць у гэтым месцы моцна, як нідзе.
Іншыя народы шануюць палі бітваў, дзе продкі пралівалі кроў, сваю й варожую. Але ў беларусаў іншае поле памяці – набрынялае крывёй бязьвінных.

**Працяг на старонке 8**

# НА ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЦІ АПАЗІЦЫЯНЕРАЎ ЗБІВАЛІ І ВЕРБАВАЛІ

Па традыцыі 16 ліпеня па Беларусі і па-за яе межамі прайшлі акцыі, прысвечаныя Дню Салідарнасці. Негледзячы на спёку ля ста чалавек сабралося ў гэты дзень у цэнтры Мінску, на Кастрычніцкай плошчы. Удзельнікі акцыі трымалі партрэты рэпрэсаваных палітыкаў і рыхтаваліся запаліць свечкі. Аднак тут ўмяшаліся супрацоўнікі спецназу.


З. Хведарук

Кіраўнік "Маладога фронту" **Зміцер Хведарук** назваў іх паводзіны хітрымі:

- *Яны папросту разбілі натоўп на дзве часткі: тых, хто ўжо сабраўся на плошчы, адціснулі ў бок метро. Такім чынам акцыя прайшлі ў "дзве хвалі".*

Стала традыцыяй на Дзень Салідарнасці ў Мінску праводзіць дадатковую акцыю ў абарону касцёлу бернардынцаў. У панядзелак удзельнікі акцыі сабраліся на прыступках будынку і запалілі свечкі.

Хоць сталічныя міліцыянты нікога не затрымалі, яго ўдзельнікі кажуць, што лагоднасці праваахоўных органаў у гэтым і блізка няма. **Кацярына Шацікава** лічыць, што супрацоўнікі міліцыі паводзілі сябе з удзельнікамі мірнай акцыі як заўжды брутальным чынам:

- *Затрыманні на такіх акцыях не страшаць. Іншая справа, што складана супраціўляцца нейкім людзям у цывільным, якія нават свайго прозвішча не называюць. Міліцыянты выштурхоўвалі моладзь на праезную частку, лаяліся на ўдзельнікаў акцыі.*

*Калі сядзелі ля царквы хлопцы ды дзяўчынкі, іх білі нагамі.*

Заўжды актыўна адзначаюць Дзень Салідарнасці ў Салігорску. Мясцовыя актывісты штомесяц становяцца ў цэнтрб гораду ў ланцуг неабыякавых людзей. Лідэр мясцовай філіі "Маладога фронту" **Іван Шыла** апавядае, што колькі хвілінаў моладзі ўдалося пратрымаць бел-чырвона-белы сцяг. Аднак без канфлікту з міліцыянтамі не абышлося і тут:


І. Шыла

- *Міліцыянты намагаліся затрымаць некалькі ўдзельнікаў акцыі, аднак усё абышлося: нам удалося іх адбіць і прастаяць 15 хвілін на цэнтральнай плошчы горада.*

Акцыя на Дзень Салідарнасці прайшла і ў Маскве. Тамтэйшыя беларусы пры падтрымцы палітычнага руху "Абарона" сабраліся перад беларускай амбасадай у сталіцы Расіі. Лідэр руху "Абарона" Алег Казлоўскі распавёў, што мінакам раздавалі ўлёткі з інфармацыяй пра зніклых і рэпрэсаваных беларускіх палітыкаў, а ў саму амбасаду перадалі патрабаванне вызваліць палітвязняў і спыніць пераследаванні па палітычных матывах ў Беларусі

У Магілёве быў затрыманы адзін з удзельнікаў Дня Салідарнасці. Да дзесяцікласніка **Кастуся Яўсеева** міліцыянты падыйшлі, калі той разам з сябрамі раздаваў мінакам інфармацыю пра зніклых беларускіх палітыкаў. Са слоў актывіста, ўжо ў Ленінскім ўпраўленні міліцыі яго яшчэ намагаліся і завербаваць:

- *Казалі, што дапамогуць нармальна давучыцца, каб не псаваў сваю характарыстыку і будучае жыццё. Прасілі дапамагчы з інфармацыяй пра акцыі і далі свае каардынаты.*

Магілёўскі актывіст кажа, што ад супрацы з органамі адмовіўся, а ўсе кантакты, што даў яму маёр, перадаў праваабаронцам.

# Курапаты – звычайны хвойнік. Такія ў нас паўсюль

праця г, пачатак на старонке 7





Пахаваньні ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў зафіксаваныя ў 48 гарадах і мястэчках Беларусі. У адным толькі Менску іх 11 – дачы АГПУ ў Драздах, Камароўка, Лошыца, Парк Чалюскінцаў, Трасьцянец ...

Сёньня ў Курапатах – 5-мэтровы Крыж Пакуты, Крыжовая алея, крыжы па пэрымэтры ўрочышча.

Курапацкі Крыж зноў і зноў робіцца нашай сыстэмай каардынатаў. Крыж вяртае нацыю да пачаткаў, да першасных пытаньняў быцьця : жыцьця і сьмерці, ахвяры й памяці, веры ў Ісуса Хрыста – і, нарэшце, пераможнага ўваскрасеньня.

**Павал Севярынец/ Нацыянальная ідэя**
**Фотарэпартаж saligorsk.org**

## 27 ліпеня-конкурс малюнкаў

27 ліпеня ў 19:00 ля крамы Дзіцячы сьвет адбудзецца штогадовы конкурс малюнкаў крэйдамі на асфальце.

Пераможцы атрымаюць каштоўныя прызы ад маладога Фронту. Ладзіцца традыцыйнае мерапрыемства з нагоды 17й гадавіны прыняцьця Дэкларацыі Незалежнасьці Рэспублікі Беларусі і мае адпаведную назову "Мая Радзіма Беларусь".Арганізатары разьлічваюць, што асноўнымі ўдзельнікамі конкурсу будуць прадстаўнікі менавіта гэнэрацыі моладзі, народжанай пасьля 27 ліпеня.

-Гэтыя людзі маюць іншы сьветапогляд, іншыя каштоўнасьці і перакананьні. 17 гадовыя юнакі і дзяўчаты будучыня краіны. 27 ліепня а 19й гадзіне мы зьбярэмся і адзначым такім чынам гэтую дату, малюнкі на асфальце-адна з магчымасьцяў прадэманстраваць любоў да Бацькаўшчыны,пазытыўны імпульс для гледачоў і удзельнікаў.У мінулым годзе супрацоўнікі міліцыі незаконна, ужываючы гвалт, затрымалі 8 удзельнікаў конкурсу малюнакаў, астатнія былі разагнаны.

-Мы спадзяемся, што ў гэтым годзе міліцэйская начальства ня будзе ўжываць гвалт у дачыненьні да ўдзельнікаў конкурсу малюнкаў і ня будзе затрымліваць моладзь.

## ГРУНВАЛЬДЗКАЯ БІТВА

15 ліпеня 1410 г адбылася адна з найбуйнейшых падзеяў Сярэднявечча, якая зьяўляецца адным з найвялікшых гонараў беларускае нацыі, Грунвальдзкая бітва й яскравая перамога войска Вялікага княства Літоўскага над захопніцкім войскам Тэўтонскага ордэну.

Грунвальдзкая бітва разьвеяла ўяўленьні аб нязломнасьці і непераможнасьці Тэўтонскага Ордэна. Яго палітычная і ваенная моц была зломленая. Удар для тэўтонцаў быў настолькі ашаламляльны, што землі ўсходніх славян пяць стагодзьдзяў ня ведалі нямецкай агрэсіі. Разгром крыжакоў павысіў аўтарытэт ВКЛ ў Заходняй Эўропе. Гэтая бітва й перамога над захопнікамі зьяўляецца ня толькі велізарнаю па значнасьці падзеяй, яна зьяўляецца таксама й сымбалем моцы й непераможнасьці беларускае нацыі.

Свабодны Салігорск
незалежная газэта Салігорска
Сувязь: 370-02-04 , 370-02-05 , salihorsk@gmail.com , http://gazeta.saligorsk.org
Газэта "Свабодны Салігорск". Адказнасьць за змешчаныя матэр'ялы нясуць аўтары.
Галоўны рэдактар : Жылінскій Я.Т. , Шэф-рэдактар : Рымашэвскій А.Б., Сакратар рэдакцыі : Захарчук А.У. , Галоўны прыбіральшчык : Лімонаў В.К. Надрукавана на асабістым абсталяваньні Пеці Іванова. ; Балгарыя , г.Балычок , вул. героя СССР Драбудзькі М.М., д.13 , корпус 13 , кв. 13

Дык Падпішыся!

Калі вы жадаеце рэгулярна атрымліваць нашу газэту проста паведаміце свой адрас па тэлефонах :
**8 (029) 370-02-04 , 8 (029) 370-02-05 , 8 (0174) 2-61-371**

